# ЛЮТАЎСКІЯ СОЛА

Літаральна ўчора ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў была адкрыта аўдыторыя імя Уладзіміра Мулявіна *(фота 5, 6)*. А 22 лютага Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры — філіял Нацыянальнага гістарычнага — стаў багацейшым на 17 эскізаў касцюмаў, створаных мастачкамі Валянцінай Бартлавай і Галінай Крываблоцкай *(фота 3)*. Аркушы, на адвароце якіх стаіць згода на пашыў строяў рукой Мулявіна, набытыя пры спонсарскай дапамозе кампаніі-партнёра музея, прадставілі публіцы ў рамках супольнага праекта "Уладзімір Мулявін. Спадчына вялікага маэстра" з Музеем музыканта ў Белдзяржфілармоніі і дзяржансамблем "Песняры".

Выдатныя навіны прыйшлі і са Шчучыншчыны, дзе амаратры творчасці Чэслава Немэна знайшлі новыя артэфакты, звязаныя з яго юнацтвам на Беларусі. Усе яны пасля адпаведнай прафесійнай апрацоўкі папоўняць фонды клуба-музея Немэна ў яго родных Старых Васілішках. Пра гэта, дарэчы, чытайце на старонках 6 — 7 *(фота 2, 4)*.

21 лютага адбылося ўшанаванне народнага артыста Беларусі, прафесара, дырэктара — мастацкага кіраўніка Заслужанага калектыва Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра краіны Міхаіла Фінберга. Падрабязна — на старонцы 2 *(фота 1)*.

Таксама днямі ў беларускім кантэксце ўзнікла яшчэ адна зорка — з сусветнай поп-рок-сцэны. Лідар амерыканскага гурта "Aerosmith" Стывен Тайлер мае карані з беларускай зямлі. Аказваецца, ён унук брата пісьменніка Фларыяна Чарнышэвіча, што паходзіць з арэалу Клічаўшчыны і Бабруйшчыны. Раман Чарнышэвіча "Надбярэзінцы" зусім нядаўна пераклалі з польскай мовы на беларускую. Нагадаем: "К" напрыканцы 2016-га ўжо знаёміла сваіх чытачоў з фрагментамі твора, датычнымі беларускіх мясцін... Так, насычанай на падзеі, датычныя знакамітых музыкантаў, аказаўся люты! І гэта не кажучы пра аншлагавае вяртанне на мінскую сцэну культавага супольнага музычнага праекта "Народны альбом"!.. Карацей, перадвясновы культурны настрой такі, як у адной з "песняроўскіх" песень: "Калі побач нараджаецца музыка..."

**Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА, Віталя РАКОВІЧА, Барыса КРЭПАКА і з архіваў "К"**


1.


3.


2.


4.



5.


6.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ